# Новы тып падліковага жэтона (лічмана) падскарбія вялікага літоўскага Андрэя Завішы*

Дзмітрый МАЦЕША



Член ГА «Беларускае нумізматычнае таварыства», Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: ozcoin@mail.ru

## Пасада падскарбія земскага (вялікага літоўскага)

Лічыцца, што пасада падскарбія ў ВКЛ з'явілася ў канцы кіравання вялікага князя Вітаўта (1382–1430), пры якім княства займала найбольшую тэрыторыю і дасягнула найвышэйшай палітычнай магутнасці. Пры Казіміры IV гэты пост быў падзелены на дзве пасады: земскага (дзяржаўнага) і дворнага (прыдворнага) падскарбія.

У сярэдзіне XVI ст., у 1566 г. пры прызначэнні на пасаду падскарбія М. Нарушэвіча вялікі князь выдаў прывілей, які вызначыў паўнамоцтвы скарбніка, яго правы і абавязкі. На земскага падскарбія была ўскладзена задача прымаць ад мясцовай адміністрацыі «платы і пажыткі з гаспадарскіх замкаў і палацаў, месцаў і валасцей» з прыходна-расходнымі справаздачамі. Галоўны скарбнік мог падвяргаць секвестру маёнткі прадстаўнікоў мясцовага кіравання за растрату дзяржаўных сродкаў або несвоечасовае іх пералічэнне ў скарб. Без яго дазволу нельга было займацца распрацоўкамі ў гаспадарскіх пушчах. Падскарбій атрымаў права на ўстанаўленне натуральных і грашовых збораў ад насельніцтва ў велікакняжацкіх маёнтках, наданне падатковых ільгот. Ён мог інспектаваць вядзенне гаспадаркі, а ў выпадку занятасці даручаць гэтую працу сваёй даверанай асобе.

Падскарбію былі прадастаўлены шырокія паўнамоцтвы ў кіраванні мытнай дзейнасцю дзяржавы. Без рашэння падскарбія, узгодненага з вялікім князем, нельга было адмяняць або памяншаць мытныя плацяжы. Ён атрымаў права прызначаць мытнікаў. Пры гэтым сам гаспадар без узгаднення з падскарбіем не мог раздаваць мыта ў арэнду або перадаваць «да вернай рукі» – сабе як вялікаму князю. Без подпісу падскарбія нельга было выдаваць мытныя грошы і ўключаць у справаздачу выдадзеныя без яго дазволу сродкі.

Таксама адной з важных функцый вялікага літоўскага падскарбія была арганізацыя чаканкі манеты. Як пацвярджэнне важнасці сваёй пасады, падскарбій размяшчаў на манетах свой герб, які выконваў ролю своеасаблівага «подпісу», даводзячы да жыхароў княства інфармацыю аб тым, хто ў дзяржаве кіруе грашова-фінансавай сістэмай. На *малюнку 1* мы бачым «Траяк» з гербам «Ляліва» падскарбія вялікага літоўскага Яна Глябовіча.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што пасада падскарбія ў ВКЛ з дзяржаўнага скарбніка ператварылася ў кіраўніка фінансавага і фіскальна-мытнага ведамства з сумяшчэннем функцый кіраўніка эмісійнага цэнтра.



*Манета 3 грошы (траяк). Рэч Паспалітая часоў праўлення Стэфана Баторыя*

***Малюнак 1***

## Род Завішаў

Падрабязнасці жыцця шляхецкага роду Завішаў вядомы дзякуючы мемуарам, якія пакінуў мінскі ваявода Крыштаф Станіслаў Завіша ў пачатку XVIII ст. (Pamiętniki Krzysztofa Zawiszy – «Успаміны Крыштафа Завішы»). У сярэдзіне XIX ст. яны былі пера-

* *Аўтар выказвае шчырую падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы гэтага артыкула супрацоўнікам Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (Ян Лялевіч) і Нацыянальнага музея ў Варшаве (Muzeum Narodowe w Warszawie, Jerzy Rekucki). Аўтар будзе ўдзячны за звесткі аб падліковых жэтонах ВКЛ з тэрыторыі Беларусі і іншых краін. Наяўную інфармацыю з фотаздымкамі можна дасылаць на электронную скрыню: ozcoin@mail.ru.*

кладзены з лацінскай мовы на польскую, а некалькі гадоў таму выдавец Віктар Хурсік пераклаў іх і выдаў на беларускай мове.

Род Завішаў бярэ свой пачатак у Польшчы, але ў сувязі з перасяленнем яго асобнай галіны ў ВКЛ і парадненнем з тутэйшымі магнатамі дазволім сабе лічыць яго літвінскім або русінскім (як называлі сябе самі жыхары ВКЛ). У XVI ст. Андрэй Завіша ўзяў шлюб з адзінай дачкой ваяводы Кежгайлы Барбарай, у пасаг бацька аддаў графства Бакшты з цэнтрам у Смілавічах. У дадатак Завіша ўзяў сабе герб Кежгайлы «Лебедзь» і прозвішча Завіша-Кежгайла *(малюнак 2)*.

Разам з Бакштамі Андрэй Завіша атрымаў і тытул графа, які насіў род да XIX ст. і які прызнаваўся каралямі. Але пасля падзелу Рэчы Паспалітай Завішы не здолелі пацвердзіць сваё шляхецкае паходжанне.

Андрэй Завіша меў сыноў Мельхіёра і Яна. Апошні, у сваю чаргу, меў ад шлюбу з Яўхіміяй Вярбіцкай трох сыноў – Яна (1550–1626), Юрыя (1555–1590) і Андрэя (1557–1604), падскарбія.

**Генеалагічная табліца Завішаў**

**Ян + ?**

↓

**Андрэй + Барбара Кежгайла**

↓

**Ян з Ракава + Яўхімія Вярбіцкая**

↓

**Андрэй (1557–1604), ваявода мінскі, падскарбій вялікі літоўскі + Сафія Валовіч**

↓

**Крыштаф (1578–1670), вялікі літоўскі маршалак, віленскі кашталян + Кацярына Тышкевіч**

↓

**Андрэй Казімір (1618–1678), вялікі літоўскі пісар, стараста мінскі + Аляксандра Агінская**

↓

**Крыштаф Станіслаў (1666–1721), ваявода мінскі + Тэрэса Тышкевіч**

***Малюнак 2***

### Падскарбій і яго лічманы

Звестак пра Андрэя Завішу захавалася не так шмат. Ён нарадзіўся ў 1557 г. у сям'і Яна Завішы і Яўхіміі з Вярбіцкіх. Быў ваяводай мінскім у 1596–1598 гг. Уладальнік часткі маёнтка «Бакшты» (таму пісаўся «на Бакштах Завіша»). У сваіх мемуарах Крыштаф Завіша, праўнук падскарбія, так апісвае свайго продка: «Быў то падскарбі сумленны, набожны, які баяўся Бога і любіў айчыну».

Пасаду вялікага падскарбія літоўскага Андрэй Завіша заняў 26 красавіка 1598 г. пасля смерці Дзмітрыя Халецкага, які быў падскарбіем з 6 красавіка 1590 г. па 20 студзеня 1598 г.

На *малюнках 3* і *4* можна ўбачыць срэбныя манеты наміналам у тры грошы, выбітыя на мынцы ў Вільні ў 1598 г. пры Дз. Халецкім і А. Завішы (паміж лічбаў даты – галава вала (знак майстра мынцы Шымона Лідмана) і гербы «Халецкі» і «Лебедзь» адпаведна).



*Манета 3 грошы (трояк). Рэч Паспалітая, 1598*

***Малюнак 3***



*Манета 3 грошы (трояк). Рэч Паспалітая, 1598*

***Малюнак 4***

Разам са звонкай манетай на Віленскай мынцы білі і падліковыя жэтоны – лічманы, ці, як іх яшчэ называюць, падскарбуўкі. На *малюнках 5* і *6* мы бачым падскарбуўкі Дз. Халецкага і А. Завішы. На абодвух лічманах маецца дата 1595. Пры біцці ліч-




*Падскарбуўка Дзмітрыя Халецкага, датаваная 1595 г.*

***Малюнак 5***



*Падскарбуўка Андрэя Завішы, датаваная 1595 г.*

***Малюнак 6***

мана Андрэя Завішы цалкам быў захаваны рэверс лічмана Дзмітрыя Халецкага, змяненні зведаў толькі аверс, дзе знаходзяцца ініцыялы і гербы падскарбія. Выкарыстанне рэверса жэтона папярэдняга эмітэнта дае некаторую інфармацыю для разважанняў. Напрыклад, выкарыстанне старога штэмпеля пры біцці рэверса паказвае на неабходнасць эканоміі часу, гэта значыць, што лічман патрэбен быў тэрмінова адразу пасля прызначэння Андрэя Завішы на пасаду падскарбія. Магчыма, адбываліся працэсы, якія нельга было спыняць, для абслугоўвання якіх у кароткія тэрміны патрэбен быў лічман новага падскарбія. Таксама стары рэверс на лічмане мог быць захаваны без змяненняў для забеспячэння пераемнасці паміж падскарбіямі. Напрыклад, ён мог выкарыстоўвацца пры зборы мыта або як пацвярджэнне права на яго памяншэнне.

Можна меркаваць, што з цягам часу павінен быў з'явіцца новы тып лічмана з арыгінальным (змененым) рэверсам і актуальнай датай.

Нарэшце, падліковы жэтон быў знойдзены побач з в. Балі, якая знаходзіцца ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці *(малюнак 7)*. Дыяметр лічмана складае 24,5 мм, вага 2,64 г.




*Падскарбуўка Андрэя Завішы 1602 г.?*

***Малюнак 7***

На ім няма даты альбо яна ёсць, але з-за дрэннага стану яе складана разгледзець. Можна меркаваць, што ён быў адбіты пасля выпуску лічмана з датай 1595 г., напрыклад у 1602 г. У такім выпадку на ім павінны былі быць лічбы 1602 ці хаця б 02. У падтрымку гэтага меркавання можна ўзгадаць, што ў 1602 г. на мынцы ў Вільні біліся траякі з гербам «Лебедзь» А. Завішы *(малюнак 8)*. Па стылістыцы малюнка апошнія дзве лічбы даты на трохграшовіку падобныя на лацінскія літары O Z. Магчыма літары-лічбы пры біцці лічмана пераблыталі і ў выніку атрымалася Z O.



*Манета 3 грошы (траяк). Рэч Паспалітая, 1602 г. («Траяк» с гербам «Лебедзь» падскарбія Андрэя Завішы)*

***Малюнак 8***

Вяртаючыся да апісання падскарбуўкі, трэба адзначыць, што яе аверс цалкам супадае з «папярэдняй версіяй» падскарбуўкі 1595 г. (*малюнак 6*). На ім выбіта чатырохпольная гербавая тарча, акружаная лаўрамі і абводкай, унутры тарчы – гербы: «Лебедзь», «Палукоз», «Радван» і «Праўдзіч», над тарчай – каранаваны гелм з пер'ем паўліна, па баках ініцыялы AZ. Дрэнны стан падскарбуўкі абумовіў складанасць успрымання адлюстраванай на ёй інфармацыі з дапамогай фатаграфіі. Таму для зручнасці намі была выканана прамалёўка рэверса жэтона ў чорна-белым колеры (*малюнак 7*). На адваротным баку змешчана сентэнцыя: NEC TIMER, NEC CITO (лац. «ні паспешліва, ні неабдумана»). Магчыма, з дапамогай гэтай сентэнцыі эмітэнт «тлумачыць» нам, чаму арыгінальную, адметную ад папярэдніх, падскарбуўку выбілі толькі праз некалькі гадоў пасля заняцця ім пасады падскарбія. Вышэй і ніжэй сентэнцыі размешчаны раслінныя матывы, пад ніжнім знаходзіцца літара Z, справа ад літары размешчаны перакрыжаваныя галінкі. Вяртаючыся да пытання датавання падліковага жэтона, можна сказаць, што для пацвярджэння або абвяржэння гіпотэзы аб даце біцця (у 1602 г.) застаецца дачакацца з'яўлення падскарбуўкі ў добрым стане з цалкам бачным рэльефам. Тады, у залежнасці ад наяўнасці альбо адсутнасці справа ад галін літары-лічбы O, магчыма, вырашыцца пытанне часу чаканкі падскарбуўкі.

Падсумоўваючы, трэба адзначыць, што дадзеная падскарбуўка з'яўляецца ўнікальнай і не апісана ў нумізматычнай літаратуры. Такім чынам, мы адкрываем яшчэ адну новую старонку ў гісторыі айчыннай нумізматыкі.

***Бібліяграфічны спіс:***

1. *Demel, B. Liczmany mennicze zwane podskarbiowkami / B. Demel. – Kraków, 1911.*
2. *Drożdż, K. Podskarbiówki i liczmany Rzeczypospolitej Oboiga Narodów i z Rzeczypospolita powiazane / K. Drożdż. – Warszawa, 2014.*
3. *Ivanauskas, E. Lietuviљki skaičiavimo žetonai 1546–1615 / E. Ivanauskas. – Kaunas, 2014.*
4. *Грузицкий, Ю. Подскарбий земский или казначей ВКЛ / Ю. Грузицкий // Фiнансы. Учет. Аудит. – 2014. – № 2. – С. 38–39.*
5. *Завiша, К. Успамiны Крыштафа Завiшы, ваяводы мiнскага (1666–1721): выданне з арыгiнальнага рукапiсу з заўвагамi Юльяна Барташэвiча [пер. з польскай мовы, заўвагi В. Хурсiка] / К. Завiша. – Мiнск, 2011. – 449 с.*
6. *Какареко, В.И. Монеты Великого княжества Литовского 1492–1707 / В.И. Какареко, И.Н. Шталенков. – Минск, 2005. – 80 с.*
7. *Матеша, Д. Счетные жетоны XVI–XVII вв. в собраниях на территории Беларуси / Д. Матеша // Банкаўскi веснiк. – 2018. – № 2. – С. 24–28.*
8. *Warszawskie Centrum Numizmatyczne Marek Kondrat [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.wcn.pl. – Дата доступу: 10.10.2019.*
9. *Вiкiпэдыя вольная энцыкляпэдыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.be-tarask.wikipedia.org. – Дата доступу: 10.10.2019.*

# New Type of a Jetton (Lichman) of Andrei Zavisha, Podskarbi (Treasurer) of the Grand Duchy of Lithuania

**Dzmitry MATSESHA**, *Member of the NGO "Belarusian Numismatic Society", Republic of Belarus, Minsk, e-mail: ozcoin@mail.ru.*

**Abstract.** *The article is devoted to the discovery of the jetton (lichman, padskarbouka) of Andrei Zavisha, Podskarbi (Treasurer) of the Grand Duchy of Lithuania. The position of podskarbi as the head of the financial and fiscal and customs agency with the combined functions of the head of the emission center extended wide powers. The author introduces into scientific circulation the unique jetton found in Grodno region.*